Меркаванне

ПАЛЯВАННЕ НА ТУРЫСТАЎ

Як павінна змяніцца інфраструктура?

Калі ў папярэднія гады па Беларусі падарожнічалі пераважна людзі, якія вывучаюць сваю краіну, цікавяцца яе гісторыяй і культурай, альбо сем'і з невялікім дастаткам, то пасля з'яўлення каранавіруса попыт на ўнутраны прадукт пачаў расці дзякуючы «вымушаным» турыстам, якія не змаглі вылецець за мяжу. Натуральна, каб задаволіць такіх пераборлівых спажыўцоў, галіна павінна была пераарыентавацца. Усё ж падобны кліент жадае атрымаць годны сэрвіс, — не абавязкова такі, як у заморскіх гатэлях, але на добрым узроўні.

Каранавірус даў час на тое, каб падумаць над новай лінейкай турпрадуктаў, павысіць кваліфікацыю персаналу, давесці да ладу аб'екты размяшчэння. І калі ўдасца пераадолець пандэмію, у наступныя гады такія пераўтварэнні могуць паслужыць павышэнню канкурэнтаздольнасці беларускіх гульцоў на міжнародным турыстычным рынку. Ва ўсякім разе турыстаў з Расіі і Польшчы можа стаць больш, бо Беларусь падчас пандэміі аказалася краінай, свабоднай для перамяшчэння. А гэта сёння важна для турыстаў.

Каранавірус моцна ўдарыў па лагістыцы: доўгі час беларусы нікуды не ляталі, да нас ніхто не ехаў. А калі такі працэс зацягваецца, як заўважае **старшыня Рэспубліканскага саюза турыстычнай індустрыі Філіп ГУЛЫ**, пачынаюць парушацца вытворчыя ланцужкі. Замежныя партнёры ўжо не гатовыя і не могуць пастаўляць турпатокі ў ранейшым аб'ёме. Ды і ўласныя работнікі гатэляў і транспартных кампаній пасля пэўнага прастою маглі збанкрутавацца, перапрафілявацца ці скараціцца, і, адпаведна, патрэбны час, каб усё аднавіць.

У некаторых багацейшых краінах турыстычная галіна атрымлівала пэўную фінансавую падтрымку, субсідыі, друкаваліся ваўчары. Многія шукалі свой шлях. Кітай, Злучаныя Штаты Амерыкі, Францыя, Германія, Польшча зрабілі стаўку на мясцовы турызм. Краіны з вялікай колькасцю насельніцтва змаглі загрузіць інфраструктуру дзякуючы ўласным турыстам, і заўважна, што сёння яны не надта працуюць над тым, каб стварыць умовы для выезду сваім грамадзянам.

Больш дробныя гульцы, напрыклад, Чэхія ці краіны Прыбалтыкі, наадварот, пастараліся скансалідавацца з суседзямі, каб ездзіць адно да аднаго на ўзаемавыгадных умовах.

У Беларусі ўнутраны турызм таксама стаў пэўнай палачкай-выручалачкай для прадстаўнікоў турыстычнай галіны. Праўда, кампаніям-пасярэднікам ад таго работы не прыбавілася. Грамадзянам больш выгадна самастойна купляць, напрыклад, пуцёўкі ў санаторый, ды і навошта пераплачваць за трансфер, калі да месца адпачынку можна даехаць на ўласным ці грамадскім транспарце?

Папулярнасць тых ці іншых аб'ектаў размяшчэння залежыць ад інтэрнэту — у выйгрышы тыя з іх, якія можна знайсці праз «Гугл» ці якія маюць ролікі на «Ютубе». Трэба яшчэ папрацаваць над сэрвісам — ёсць шэраг праблем з тым, каб у анлайне забраніраваць і аплаціць адпачынак.

На сёння ўнутраны турызм носіць яскравы лакальны характар. Традыцыйна мінчане стараюцца выбраць тое, што знаходзіцца не вельмі далёка ад сталіцы. Таксама многа турыстаў асядае вакол абласных цэнтраў і іншых вялікіх гарадоў.

Запатрабаваны санаторыі, нацыянальныя паркі, аграсядзібы. Зараз для беларускага турыста галоўнае — адпачыць на прыродзе, пакупацца, прагуляцца па лесе, смачна паесці. А вось культурна-пазнавальны турызм для іх хутчэй прыемны дадатак. Асаблівага попыту на тое, каб спецыяльна паехаць паглядзець іншыя гарады, напрыклад, на выхадныя, пакуль няма. Можа, праблема ў тым, што проста не хапае інфармацыі пра такі варыянт баўлення вольнага часу? Ці адпаведных турпрадуктаў?

Каранавірус агаліў тыя праблемы, над якімі трэба ў найбліжэйшы час працаваць, каб узняць унутраны турызм на вышэйшы ўзровень. Так, нягледзячы на тое, што сёння многія санаторыі прапануюць рэлаксацыйныя працэдуры, пакуль яшчэ адчуваецца недахоп спа-комплексаў.

Не хапае дамкоў, баз адпачынку эканом-класа на прыродных тэрыторыях. Сёння развіваецца рачны турызм, пад які таксама трэба рабіць інфраструктуру: абсталяваныя стаянкі, інфармацыйныя рэсурсы пра іх у сеціве, магчымасць забраніраваць месца праз інтэрнэт, забеспячэнне харчаваннем. Прыродныя тэрыторыі, куды гатовы выбірацца турысты, таксама ў нас пакуль застаюцца дзікімі — неабходна працягваць ствараць веласцежкі і пункты пракату.

Філіп Гулы ўпэўнены, што будучыня турызму — за стварэннем кластарных сістэм. Ён параўнаў работу з турыстамі з прамысловай рыбалкай. Турпатокі, як і касякі рыб, рухаюцца па пэўных законах, якія трэба вывучаць, аналізаваць і выкарыстоўваць. Нават перапады тэмператур, глабальнае пацяпленне могуць уплываць на тое, куды накіроўцца турыстычныя групы. Менавіта кластары здольныя прываблiваць гасцей на пэўную тэрыторыю. Розныя галіны павінны аб'ядноўвацца, каб ствараць адзіны турыстычны прадукт. Напрыклад, аграпрамысловы комплекс, фермеры ці мясцовыя жыхары могуць прапаноўваць прадукты — асаблівы попыт будзе на экалагічную ежу. Лясная гаспадарка забяспечыць грыбамі, ягадамі, зёлкамі (фітатэрапія і чаі). Прадпрымальнікі будуць здаваць напракат байдаркі і веласіпеды. Знойдзецца работа і краязнаўчаму музею, і рамеснікам, і работнікам культуры, якія возьмуць на сябе культурна-займальную праграму. Важна інтэграваць і мясцовых жыхароў, якія могуць знаёміць традыцыямі і рэцэптамі з свайго краю.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Культасвета

Сямігадзінны анлайн-канцэрт класічнай музыкі адбыўся ў Мінску

Пакуль большасць канцэртных залаў і музычных тэатраў усё яшчэ закрытыя для наведвальнікаў, прафесійныя музыкі і аматары з розных краін аб'ядналіся, каб сустрэцца з публікай хоць віртуальна. Амаль сем гадзін доўжыўся канцэрт «Грандлета», зладжаны нядаўна першай у Беларусі прыватнай музычнай школай Арцёма ШАПЛЫКІ.

«Справаздачныя канцэрты нашай школы праходзяць некалькі разоў на год, — зазначае кіраўнік прыватнай музычнай школы, саліст Белдзяржфілармоніі Арцём Шаплыка, — і для нас вельмі важна, каб вучні, людзі розных узростаў і прафесій, мелі магчымасць выступіць перад публікай нароўні з прафесіяналамі. Таму сёлета, нягледзячы на складаную эпідэміялагічную сітуацыю, канцэрт мы вырашылі не толькі не адмяняць, але з дапамогай сучасных тэхналогій правесці яго на міжнародным узроўні».

Ідэю падхапілі іншыя музычныя навучальныя ўстановы — вучні і педагогі Рэспубліканскай гімназіі-каледжа пры Акадэміі музыкі, школ мастацтваў з Мінска, Магілёва, Іванава, Наваполацка, Царскасельскай гімназіі мастацтваў, Прынстанскай струннай акадэміі,



Акадэміі музыкі і танца з Іерусаліма... Удзел у анлайн-імпрэзе ўзялі больш за 100 юных і дарослых музыкантаў з Беларусі, Расіі, Украіны, Вялікабрытаніі, Германіі, ЗША, Ізраіля, Мексікі, Нарвегіі, Францыі і нават Сенегала. У незвычайным канцэрце былі прадстаўленыя творы для сямі музычных інструментаў — фартэпіяна, флейты, скрыпкі, гітары, балалайкі, арфы і віяланчэлі, — а таксама некалькі вакальных нумароў. Акрамя класічных твораў Баха, Моцарта, Бетховена, Шапэна і іншых вялікіх прагучалі творы сучасных выканаўцаў — кампазітараў XX стагоддзя Уільяма Гілака і Скота Джопліна, амерыканскага электроншчыка Marshmello.

Асаблівую атмасферу мерапрыемству надала незвычайная сцэнічная прастора — не толькі канцэртныя залы, але і ўтульныя дамашнія інтэр'еры, загарадныя ўчасткі і нават адкрытыя пляцоўкі проста пасярод лесу... Відэазапіс канцэрта ў інтэрнэце паглядзелі ўжо больш за 4 тысячы чалавек. Наступнае выступленне вучняў музычнай школы, як плануецца, пройдзе 30 жніўня і ўжо ў афлайн-фармаце — на малой сцэне Белдзяржфілармоніі.

Вікторыя ЗАХАРАВА.
Фота арганізатараў імпрэзы.

Грошы

На грамадскае абмеркаванне выносіцца...

Нацбанк прапануе змены ў закон аб гарантаваным пакрыцці банкаўскіх укладаў насельніцтва

Як паведамляе прэс-служба Нацыянальнага банка краіны, на грамадскае абмеркаванне вынесены праект дакумента «Аб змене законаў», які прадугледжвае карэкціроўку закона ад 8 ліпеня 2008 года № 369-З «Аб гарантаванай кампенсацыі банкаўскіх укладаў (дэпазітаў) фізічных асоб».

Якія асноўныя навіны збіраецца замацаваць у выніковым дакуменце фінансавы рэгулятар краіны? У праекце прапануецца ўвесці гарантаванае пакрыццё грашовых сродкаў, размешчаных індывідуальнымі прадпрымальнікамі на рахунках і (або) ва ўкладах у банках з устанаўленнем для гэтай новай катэгорыі ўкладчыкаў абмежавання па суме кампенсацыі.

Акрамя таго, Нацбанк гатовы скараціць з аднаго месяца да сямі дзён (з даты падачы заявы аб выплаце кампенсацыі) тэрмін выплаты кампенсацыі дэпазітаў па заявах, якія не патрабуюць дадатковага вывучэння. Пры неабходнасці дадатковага вывучэння захоўваецца тэрмін у адзін месяц.

Прапануецца таксама даць фізічным асобам, якія не з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, магчымасць выбару спосабу выплаты кампенсацыі (наяўнымі грашовымі сродкамі ў банку — павераным альбо ў безнаяўным парадку з дапамогай пералічэння на паказаны ў заяве бягучы банкаўскі рахунак фізічнай асобы).

Улічваючы сур'ёзнасць тэмы, супрацоўнікі банкаўскай сферы рэкамендуюць павялічыць з двух да пяці гадоў працягласць часу, на працягу якога ўкладчыкі маюць права звярнуцца па кампенсацыю банкаўскага ўкладу. Акрамя таго, прапануецца перайсці да сістэмы дыферэнцыраваных узносаў банкаў у рэзерв дзяржаўнай установы «Агенцтва гарантаванай кампенсацыі банкаўскіх укладаў (дэпазітаў) фізічных асоб», у адпаведнасці з якой велічыня ўзносаў банкаў будзе залежаць ад узроўню рызык, якія прымаюцца банкамі пры ажыццяўленні сваёй дзейнасці. Рэгулятар раіць пашырыць магчымасці для інвеставання часова свабодных грашовых сродкаў гэтага агенцтва.

Праўленне Нацыянальнага банка лічыць, што рэалізацыя палажэнняў праекта ракона дасць магчымасць павысіць узровень прававой абароны ўкладчыкаў, у тым ліку фізічных асоб, якія выступаюць у якасці індывідуальных прадпрымальнікаў, палепшыць якасць абслугоўвання гэтых кліентаў, забяспечыць стабільнае фінансаванне рэзерву агенцтва, павысіць эфектыўнасць функцыянавання сістэмы гарантаванага пакрыцця банкаўскіх укладаў насельніцтва і ўстойлівасць банкаўскага сектара.

Нацыянальны банк адзначае, што заўвагі і прапановы могуць быць выказаны ў спецыяльнай тэме на прававым форуме Беларусі з 10 да 20 ліпеня 2020 года.

Сяргей КУРКАЧ.

ЖЫЦЦЁ НАНОВА Ў ЯНОВЕ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аўталаўка прыязджала два разы на тыдзень. Часам з палатак гандлявалі прыватнікі. Мясцовыя кажуць, што тавары заезджых гандляроў часта каштавалі даражэй, чым у магазінах. Хто маладзейшы, у каго машыны, то, вядома, ездзілі ў суседні Стаўбун — населены пункт, што за восем кіламетраў ад Янова, бо там тры крамы. Хтосьці ездзіў у гіпермаркет у Ветку. У каго машыны няма ці з-за эпідэміялагічнай сітуацыі асцерагаўся дабірацца далёка на аўтобусе, той, як кажуць мясцовыя, «вартаваў» аўталаўку.

Людміла Вітальеўна — член ініцыятыўнай групы па зборы подпісаў у падтрымку вылучэння кандыдатам у прэзідэнты Аляксандра Лукашэнкі. З гонарам зазначае, што яна 26 гадоў у «прэзідэнцкай камандзе»:

— Цяпер, збіраючы подпісы за Аляксандра Рыгоравіча, традыцыйна абыходзіла дамы. Куды ні зойдзеш, у кожнай хаце: напішы наша пажаданне, каб магазін адкрылі. Людзі верылі, што ім дапамогуць на самым высокім узроўні. Я перадала звесткі ў раён і расказала, як людзі чакаюць і спадзяюцца на тое, што зноў будзе крама ў Янове.

І вось ужо тыдзень, як яна зноў працуе: штодня свежыя малако ды хлебабулачныя вырабы, каўбасы, рыба, бакалея, паўфабрыкаты... Не менш важна — марожанае ды розныя прысмакі для дзетак і ўнукаў.

Пастаянны пакупнік — мясцовая жыхарка Вера Ганчарова — прызнаецца: больш як два месяцы без крамы — выпрабаванне для ўсяго аграгарадка. Пенсіянерка не хавае радасці, дзякуе ўсім, хто дапамог аднавіць работу гандлёвага пункта:

— Дзякуй богу, адкрылі. Вось колькі людзей ходзіць, а раней так перажывалі...

Цяпер крама ў Янове пад кіраўніцтвам цэнтральнага рынку Гомеля. Асартымент уражвае. Прадавец — малады спецыяліст Кацярына, толькі скончыла каледж. Родам з суседняга Стаўбуна. Мясцовым гэта падабаецца, кажуць свая, вясковая, не спужаецца работы на вёсцы.

Атрымалася ў Янове і забяспечыць новага прадаўца жыллём. Прапанавалі пакой у кватэры, што пабудавана пры ФАПе. Дарэчы ў жніўні ў аддалены аграгарадок прыедзе яшчэ адзін доўгачаканы малады спецыяліст — новы фельчар, для якога таксама ёсць асобны пакой. Вырашылі, што будуць жыць разам — так весялей.

Увогуле 2020 год для Янова сапраўды знамянальны. Сёлета адкрылі станцыю абезжалезвання. У новай частцы забудовы аграгарадка — цэнтральнае водазабеспячэнне. Воданапорную вежу пабудавалі 12 гадоў таму, вада была дрэннай якасці. Станцыя — сапраўды падарунак для ўсіх вясковых сем'яў.

Да таго ж сёлета пачнецца мадэрнізацыя кацельні, якую аснасцяць найноўшым абсталяваннем, і функцыянаваць яна будзе ў аўтаматычным рэжыме. Гэта таксама сацыяльна значны аб'ект для аграгарадка, бо кацельная абагравае дзіцячы сад, школу, дом культуры.

Што датычыцца пераносу гандлёвага пункта, які працуе ў старой частцы Янова, то таксама ёсць магчымасць абсталяваць краму ў другім будынку ў цэнтры аграгарадка, каб усім жыхарам было зручна дабірацца. Гэта планы на перспектыву. Цяпер жа яноўцы спадзяюцца на адно, што мясцовыя дзеці, скончыўшы школу ды адвучыўшыся, вернуцца назад, дадому. Тады ў іх Янове будуць і добры гандаль, і шчаслівыя пакупнікі.

Наталля КАПРЫЛЕНКА,
фота аўтара.

Памяць

Самаходка для Буйніцкага поля

Арсенал баявой тэхнікі на мемарыяльным комплексе «Буйніцкае поле» ў Магілёве папоўніла савецкая супрацьтанкавая самаходная артылерыйская ўстаноўка Су-100. Яе ўрачыстая перадача адбылася падчас мерапрыемства, прысвечанага 79-й гадавіне абароны Магілёва і 75-й — са дня Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

Падобныя ўстаноўкі з'явіліся на ўзбраенні Чырвонай Арміі пасля таго, як праціўнік стаў выкарыстоўваць новы цяжкі танк «Тыгр», лабавая браня якога таўшчынёй 101 міліметр не прабівалася з дыстанцыі 500 метраў бранябойнымі снарадамі. Самаходка заняла сваё пачэснае месца на гераічным полі. Гэты тып тэхнікі выкарыстоўваўся ў баявых дзеяннях па вызваленні краін заходняй Еўропы са студзеня 1945 года.

У гонар абаронцаў і вызваліцеляў Магілёва былі ўскладзены кветкі да падножжа капліцы, адбылася рэканструкцыя баёў 1944-га за вызваленне Буйніч.

Удзельнікі мітынгу ўшанавалі памяць герояў хвілінай маўчання, быў дадзены трохразовы ружэйны залп.

Са словамі ўдзячнасці за мірнае неба над галавой і стабільнасць у краіне выступіў **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Леанід ЗАЯЦ**. Ён падзякаваў Прэзідэнту за асабісты ўнёсак у вырашэнне пытання па перадачы гэтага сімвала мужнасці Савецкай арміі. Словы ўдзячнасці за ўдзел у агульнай справе ён таксама адрасаваў Міністэрству абароны і шклоўскім пошукавікам ваенна-патрыятычнага клуба «Пошук», якія аднавілі тэхніку. Удзел у цырымоніі ўзяў **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Андрэй КУНЦЭВІЧ**, які таксама нагадаў пра неабходнасць берагчы мір і не забываць подзвіг абаронцаў і вызваліцеляў краіны. Ён падкрэсліў той факт, што перадачу тэхнікі Магілёву падтрымаў кіраўнік дзяржавы. «Для Беларусі тэма Вялікай Айчыннай вайны асобая, такіх месцаў у нас шмат, і Буйніцкае поле адно з іх, — канстатаваў ён. — Тут не трэба доўга расказваць пра тое, што адбылося, — дастаткова ўглядзецца ў мемарыяльныя пліты, паглядзець экспанаты, каб прасякнуцца ўзнёслым духам подзвігу савецкага салдата».

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Лета. Беражыце дзяцей

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У апісаным вышэй выпадку ўсё ж такі бацькі прынялі неабходныя меры бяспекі — хто ведаў, што нашчадак пастараецца іх перахітрыць?! А вось у дамах з меншымі дзецьмі, якія ляцелі ўніз ледзь не ў адзін дзень з кобрынскім таварышам па няшчасці, вокны былі адчыненыя. Кажу пра здарэнні ў Брэсце, Віцебску, Віцебскім раёне. На вокнах стаялі маскітныя сеткі, бацькі палічылі гэта дастатковым. Але, як паказвае практыка, сетка не вытрымлівае вагі нават двухгадовага дзіцяці. Усім названым «героям свабодных палётаў», як і іх бацькам, пашанцавала. Яны выжылі, папраўляюцца. Але так бывае, на жаль, не заўсёды. Амаль кожны год мы маем і трагічныя выпадкі. Вось і некалькі дзён таму ў сталіцы з акна выпала трохгадовае дзіця, якое загінула.

Адзін дома

Фактычна штогод з такімі пацыентамі працуе **загадчык траўматолага-артапедычнага аддзялення Брэсцкай абласной дзіцячай бальніцы Андрэй БРАЗОЎСКІ.** «Кожны спадзяецца, што з яго дзіцем гэта не здарыцца, — кажа Андрэй Мікалаевіч. — Але ж дзеці, асабліва ў тры-чатыры гады, не ўсведамляюць небяспеку. Яны становяцца на падаконнік, смела глядзяць уніз. Адна секунда — і маленькі чалавек ужо там. І тады — альбо яго больш няма, альбо цяжкае працяглае лячэнне, рэабілітацыя і ўсе наступствы».

Дарэчы, у Андрэя Бразоўскага некалькі гадоў таму лячыўся хлопчык, які выпаў з балкона на сёмым паверсе. Забягаючы наперад, скажу, што сямігадовае дзіця пайшло з бальніцы сваімі нагамі. Здавалася б, амаль радавы выпадак. Яго асаблівасць у тым, што хлопчык сумаваў адзін дома, ён чакаў маму з работы, выглядваў у акно, а потым залез на шафку, пацягнуўся па цацку і выпаў. Потым, калі сталі высвятляць абставіны здарэння, даведаліся, што маці хлопчыка была разведзеная з яго бацькам, выхоўвала дзіця адна. Графік яе работы прадугледжваў занятасць у асобныя выхадныя дні. Тады малы заставаўся адзін, бо яго не было з кім пакінуць. Названая акалічнасць і давяла да бяды — хлопчык выпаў 9 мая. Але ж гэта зноў выключэнне. Часцей за ўсё дзеці выпадаюць, калі бацькі не на рабоце, не ў магазіне, а ў суседнім пакоі.

Фатальная выпадковасць ці недагляд?

Скажаце, так бывала і раней? Бывала, не буду спрачацца. Нядаўна чытала пра генерала авіяцыі, двойчы Героя Савецкага Саюза Якава Смушкевіча, які на пачатку 1940-х не пазбегнуў сталінскіх рэпрэсій. Звярнула на сябе ўвагу такая акалічнасць. Якаў Уладзіміравіч пэўны час служыў у Віцебску, у тую пару сям'я перажыла гора: з балкона выпала і загінула малая дачка. Генеральскія жонкі тады, як правіла, не працавалі, часта мелі памочніц па гаспадарцы (хоць пра гэта ў біяграфічным артыкуле не сказана). У любым выпадку, дзіця недагледзелі.

Дык вось гэты выпадак я прывяла ў якасці прыкладу нядаўна ў прыватнай гутарцы з адным нашым парламентарыем. Ён выказаўся за тое, каб адказнасць бацькоў за выпадкі траўміравання дзяцей замацоўваць у заканадаўчым парадку. Не пагадзілася з суразмоўцам, бо апошняе вельмі цяжка будзе зрабіць. На мой погляд, паміж няшчасным выпадкам, фатальнай выпадковасцю і прамой віной, гэта значыць недаглядам, вельмі тонкая мяжа. Цяперашні дэпутат, дарэчы, згадаў, што і сам у дзяцінстве два ці тры разы быў на краёчку гібелі, бо бацькі, вясковыя настаўнікі, днямі прападалі на рабоце, а ён, малодшы школьнік, гадзінамі гойсаў па двары ў кампаніі равеснікаў.

Канкурэнты матчынай увагі

Кожны з бацькоў павінен сам адчуваць гэтую мяжу і не даводзіць да краю. А вось што перашкаджае адчуць цяпер, дык гэта гаджэты. Не раз даводзілася бачыць, як юная матуля, ледзьве пагойдваючы каляску нагой, не вылазіць са смартфона. А ўчора на адным з расійскіх каналаў ўбачыла частку сюжэта пра вядомага спартсмена, які судзіцца з былой жонкай за дзяцей. Суд чарговай інстанцыі нарэшце прыняў рашэнне на карысць маці. І вось гэтая маладзіца ў атачэнні адвакатаў і сяброўак паехала да дома бацькоў свайго былога ў спадзяванні хоць убачыцца з дочкамі, якіх даўно ў яе забралі. Адначасова каментавала свой візіт: маўляў, каб былыя родзічы не паспелі зрабіць непажаданых захадаў, яна (увага!) нават у сацыяльных сетках не паведамляла, куды едзе. Значыць, кожны свой крок, кожную паездку нават у межах кіламетра гэтая асоба, маці дваіх дзяцей, анансуе ў сацсетках. На жаль, гэтак жа робяць шмат яе равесніц, калі не большасць. На падобныя пасты і іншую пісаніну ды на прагляд рэакцыі патрэбны час. А нашыя маладыя мамкі часта ўжо залежныя ад сваіх электронных двайнікоў. Ад усяго пералічанага надзвычай часта церпяць дзеці і ў прамым, і ў пераносным сэнсе. І калі школьнікам нярэдка забараняюць тэлефоны на ўроках, а некаторыя бацькі, бабулі з дзядулямі абмяжоўваюць карыстанне імі нават на канікулах, то ў чалавека, які стаў дарослы, яго ніхто не адбярэ. Гэтым і карыстаюцца юныя маці. Як каторая з іх увесь час сядзіць утаропіўшыся ў экран, то дзіця пачынае сумаваць і само прыдумляе забаўлянкі, часам вельмі небяспечныя. Іншымі словамі, калі з малым недастаткова гавораць, не дапамагаюць пазнаваць свет, ён сам пачынае гэта рабіць. Ну а пасля няшчасных выпадкаў, калі ў дом прыходзяць прадстаўнікі адпаведных службаў, пачынаюць разбірацца, ніводная ж не прызнаецца, што сядзела ў тэлефоне. Скажа — на хвілінку выйшла на кухню, каб выключыць суп. Але ж сама яна будзе ведаць праўду, і ёй з гэтым жыць. Можа, якія адмысловыя праграмы распрацоўваць і ставіць іх на смартфоны маладых матуль, каб кожныя пяць хвілін напаміналі ім пра іх малых?

Святлана ЯСКЕВІЧ.